# ДАСЛЕДАВАННЕ

**SA #03/2015BE, 08 снежня 2015 г.**

Belarusian Institute for Strategic Studies biss

# ЦЕНЯВАЯ ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ Ў РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ

**Аляксей Пікулік, Алена Арцёменка**

## Рэзюмэ

Даследаванне прысвечана аналізу грамадскага ўспрымання ценявой эканомікі і ацэнцы ўцягвання грамадзян у ценявую дзейнасць. Мэта работы – дэманстрацыя і аналіз вынікаў рэпрэзентатыўных апытанняў грамадскай думкі, праведзеных у траўні–чэрвені 2015 года адначасова ў Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Польшчы і Швецыі. BISS выступіў у якасці ўдзельніка даследчага кансорцыуму, які быў арганізаваны і працаваў пад кіраўніцтвам Літоўскага інстытута свабоднага рынку Літвы (LLRI).

У даследаванні выкарыстана «вузкая» трактоўка тэрміну «ценявая эканоміка», якая ўключае рынкавую вытворчасць выключна законных тавараў і паслуг, якія наўмысна прыхоўваюцца ад дзяржаўных органаў. Унікальнасць дадзенага даследавання заключаецца як у шырокім рэгіянальным ахопе (шэсць краін адначасова), так і ва ўніфікацыі метадалогіі аналізу. Апытанні праводзіліся даследчай кампаніяй SprinterResearch метадам CAWI (ComputerAssistedWebInterview). Агульная выбарка склала 6035 рэспандэнтаў, выбарка па Беларусі — 1002 (18-75 гадоў, структураваная па поле, узросце і тыпе населеных пунктаў).

Асноўныя высновы даследавання, якія тычацца Беларусі:

- Аб’ём ценявой занятасці (праца без афармлення ці атрыманне заробкаў у канверце) у Беларусі з’яўляецца найбольшым у параўнанні з іншымі краінамі, у якіх праводзілася даследаванне, і можа быць ацэнены ў 33% ад ВУП.

- Аб’ём пакупак, здзейсненых «у ценю» (у прадаўца, які не дэкларуе транзакцыю ці не з’яўляецца легальным), таксама большы, чым у пяці іншых краін і можа быць ацэнены ў 4,9% ад ВУП.

- Беларускія рэспандэнты разумеюць рызыку быць злоўленымі і ўспрымаюць пакаранне як дастаткова суровае.

- Сектары, у якіх ценявая дзейнасць найбольш распаўсюджаная, гэта: будаўніцтва і рамонт, аптовы і рознічны бізнес, звязаны з гандлем вопраткай і прадуктамі харчавання, аўтамабільны бізнес, а таксама бізнес, звязаны з продажам бытавой тэхнікі.

- Уцягванне ў ценявую эканоміку беларусы тлумачаць эканамічнымі прычынамі (кошт тавараў на «шэрым» рынку ніжэйшы, заработная плата «ў канверце» дазваляе пазбегнуць падаткаў і, адпаведна, павялічваць даход). Зніжэнне цэн і рост даходаў могуць знізіць аб’ём «ценявога» сектара.

- Больш эканамічна актыўныя людзі (мужчыны, людзі з больш высокім даходам) ацэньваюць рызыку ад удзелу ў ценявой дзейнасці як больш нізкую. Гэта з’яўляецца дадатковым

драйверам развіцця ценявога сектара, паколькі гэтыя людзі могуць выступаць як лідары меркаванняў.

- Занятасць у ценявой эканоміцы больш характэрная для найменш сацыяльна абароненых груп. Такія тэндэнцыі робяць феномен яшчэ больш сацыяльна небяспечным.

## Змест

Рэзюмэ ........ 1
Уводзіны ........ 4
Фактары ценявой эканомікі ........ 5
2. Успрыманне ценявой эканомікі. Верагоднасць быць злоўленым і ўспрыманне пакарання .. 7
3. Уцягванне ў ценявую эканоміку ........ 12
4. Ценявая эканоміка: прыблізныя разлікі на макраўзроўні ........ 15
5. Драйверы на мікраўзроўні: урокі з Беларусі ........ 16
Высновы ........ 18
Літаратура ........ 19

## Уводзіны

У даследаванні выкарыстоўваецца «вузкая»[1] трактоўка тэрміна «ценявая эканоміка», якая ўключае ў сябе рынкавую вытворчасць выключна законных тавараў і паслуг, якія наўмысна прыхоўваюцца ад дзяржаўных органаў. Асноўныя прычыны: ухіленне ад выплаты падаходнага падатку, ПДВ і іншых падаткаў; ухіленне ад выплаты ўзносаў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва; ухіленне ад выканання заканадаўчых патрабаванняў, устаноўленых для рынку працы, напрыклад, мінімальнай заработнай платы або максімальна дапушчальнай працягласці працоўнага часу; ухіленне ад выканання пэўных адміністрацыйных абавязацельстваў. Такім чынам, каб пазбегнуць тэрміналагічнай блытаніны, у вызначэнні фокус робіцца толькі на тых **легальных, але не зарэгістраваных** відах эканамічнай дзейнасці, якія маглі б улічвацца (у выпадку іх рэгістрацыі) пры разліку валавога нацыянальнага прадукту.

З аднаго боку, практыкі ценявой эканомікі наносяць шкоду фіскальнаму здароўю дзяржавы і пераследуюцца па законе. З іншага – у ценявой эканоміцы таксама ствараецца эканамічная вартасць. Паколькі ценявая эканоміка з’яўляецца вытворнай ад якасці правілаў гульні ў эканоміцы, мэта барацьбы з «шэрай дзейнасцю» павінна заключацца не столькі ў ампутацыі праблемных зон, колькі ў стварэнні спрыяльных заканадаўчых умоў для легалізацыі дзейнасці, г. зн. у выхадзе «з ценю на святло». Для таго, каб меры па барацьбе з ценявой эканомікай сталі эфектыўныя, перш чым пераходзіць да планавання інстытуцыйных зменаў, патрабуецца вывучэнне меркавання тых, чые эканамічныя практыкі павінны быць адкарэктаваныя. Менавіта таму даследчыя намаганні былі накіраваныя на тое, каб спусціцца з макра- на мікраўзровень і менавіта на ім даведацца матывы, успрыманне і стаўленне людзей да ценявых эканамічных практык.

Унікальнасць дадзенага даследавання заключаецца як у шырокім рэгіянальным ахопе (шэсць краін адначасова), так і ва ўніфікацыі метадалогіі аналізу. Апытанні праводзіліся даследчай кампаніяй Sprinter Research метадам CAWI (Computer Assisted Web Interview). Агульная выбарка склала 6035 рэспандэнтаў, выбарка па Беларусі – 1002 (18-75 гадоў, структураваная па поле, узросце і тыпе населеных пунктаў).

У першай частцы працы – кароткая тэарэтызацыя і апісанне асноўных драйвераў росту шэрай эканомікі; у другой – параўнальны аналіз грамадскага ўспрымання ценявой эканомікі; у трэцяй частцы разглядаецца ступень уцягнутасці грамадзян у ценявую эканоміку ў шасці краінах і прапанаваныя папярэднія ацэнкі аб’ёмаў шэрай дзейнасці. Пасля гэтага разглядаюцца асноўныя фактары, якія ўплываюць на ценявую эканоміку Беларусі. У заключэнні прадстаўленыя самыя цікавыя вынікі і пералічаныя асноўныя меры па барацьбе з ценявой эканомікай.

[1] Больш шырокае вызначэнне ценявой эканомікі ўключае аперацыі як легальныя, так і нелегальныя. Прыкладамі першых з’яўляюцца няўлічаныя даходы, атрыманыя ад легальнай дзейнасці, здзелкі з незадэкларыванымі таварамі, ухіленне ад выплаты падаткаў, сыход ад падаткаабкладання і г. д. Прыкладамі другіх (незаконных) форм ценявой эканомікі з’яўляюцца: гандаль скрадзенымі таварамі, прастытуцыя, вытворчасць і продаж наркотыкаў, гандаль людзьмі, незаконны абарот зброі і г. д.

## 1. Фактары ценявой эканомікі

Мэта дадзенай главы – апісаць асноўныя драйверы росту ценявой эканомікі і дапасаваць дыскусію да нашага рэгіёну. Пачнём з невялікага экскурсу ў літаратуру па гэтай тэме.

Фельд і Шнайдар (2011) — аўтары маштабнага даследавання ценявой эканомікі[2], якое абапіраецца на крос-нацыянальны эмпірычны матэрыял, прадстаўляюць фактары, якія ўплываюць на ценявую эканоміку, наступным чынам у парадку прыярытэту:

а) *Падатковы цяжар і памер сацыяльных адлічэнняў*. Згодна з іх даследаваннем, у залежнасці ад краіны, гэтая пераменная тлумачыць ад 35 да 52 працэнтаў шэрага рынку працы (Zukauskas, 2015). Алінгам і Сандмо (1972)[3] у сваім наватарскім артыкуле адзначалі станоўчую карэляцыю паміж падатковым цяжарам і ценявой эканомікай; гэта ж было пацверджана Каніайненам з суаўтарамі (2004)[4] і Джонсанам, Каўфманам і Сойда-Лабатонам (1998a, 1998b)[5].

б) *«Падатковая мараль»* (усведамленне маральнага абавязку перад грамадствам плаціць усе падаткі). Падатковая мараль у даследаванні 2011 года тлумачыць ад 22 да 25 працэнтаў ценявой эканомікі.

в) *Якасць дзяржаўных інстытутаў*. Існуе замкнёнае кола: дзяржаўныя паслугі фінансуюцца за кошт падаткаў, таму чым большая доля ценявой эканомікі, тым менш магчымасцяў у дзяржавы забяспечыць высокую якасць паслуг. А чым менш дзяржава здольная забяспечыць паслугі прымальнай якасці, тым менш суб'екты матываваныя падтрымліваць дзяржаву сваёй дзейнасцю ў сектары афіцыйнай эканомікі. Акрамя гэтага, важную ролю граюць якасць і даступнасць паслуг. Як адзначаюць Джонсан, Каўфман і Сойда-Лабатон (1998)[6], найбольш высокія падатковыя паступленні дасягаюцца ў краінах з ніжэйшымі падатковымі стаўкамі, меншай колькасцю законаў і правілаў і нізкім узроўнем карупцыі.

г) *Інтэнсіўнасць рэгулявання.* Фельд і Шнайдар (2011) кажуць у асноўным аб рынку працы, (напрыклад, узровень мінімальнага заробку або меры супраць звальненняў). Пры гэтым варта ўлічваць і гандлёвыя бар'еры (напрыклад, квоты на імпарт) і рэгуляванне доступу замежнікаў да рынку працы (абмежаванні на свабодны рух замежных работнікаў), якія ўплываюць на развіццё ценявой эканомікі. Паколькі яны павялічваюць транзакцыйныя выдаткі для эканамічна актыўных суб'ектаў і прыводзяць да значнага росту выдаткаў на працоўную сілу, то, адпаведна, з'яўляюцца дадатковыя стымулы працаваць у ценявой эканоміцы. Так, Фрыдман з суаўтарамі (Friedman et al.) (2000) сцвярджаюць, што ўзровень існуючага рэгулявання ў значнай ступені карэлюецца з памерам неафіцыйнай эканомікі, пры гэтым яны вызначаюць накірунак сувязі як адназначна прамы: больш правілаў азначае большы аб'ём ценявой эканомікі. Іншыя аўтары, як, напрыклад, Джонсан (Johnson), Каўфман (Kaufmann) і Зойда-Лабатон (Zoido-Lobatón) (1998) мяркуюць, што якасць рэалізацыі рэгулюючых нормаў з'яўляецца ключавым фактарам.

Такім чынам, бар'еры на шляху эканамічнай дзейнасці (падатковыя стаўкі і канкрэтныя рэгуляцыі) больш за ўсё ўплываюць на выбар эканамічных гульцоў: чым вышэйшыя бар'еры, тым вышэйшая матывацыя перанесці частку або ўсю дзейнасць у цень. Пры гэтым формы

[2] Feld, L.P., & Schneider, F., Survey on the shadow economy in OECD countries, 2011.
[5]Allingham, M. G. and A. Sandmo (1972), 'Income tax evasion: a theoretical analysis'. Journal of Public Economics, 1(3): 323-38.
[4]Kanniainen, V., J. Paakonen and F. Schneider (2004), 'Fiscal and ethical determinants of shadow economy: theory and evidence', Discussion paper. Department of Economics, Johannes Kepler University of Linz, Linz, Austria.
[5]Johnson, Kaufmann, and Zoido-Lobaton (1998), Regulatory Discretion and the Unofficial Economy, American Economic Review.
[6]Тамсама.

дадзенай прычынна-выніковай сувязі вар'іруюцца ад краіны да краіны ў залежнасці ад **сацыяльных** (*напрыклад, грамадская талерантнасць да ценявой эканомікі, талерантнасць да рызыкі, усведамленне непазбежнасці пакарання*), **эканамічных** (*напрыклад, узровень жыцця, тып капіталізму*) і **юрыдычных абставінаў** (*напрыклад, якасць правапрымянення*). Прасцей кажучы, людзі сыходзяць у шэрую эканоміку, калі плаціць усе падаткі і адлічэнні занадта дорага, прытрымлівацца ўсіх правілаў – занадта складана, рызыка быць злоўленым невялікая, пакаранне не надта суровае, а разуменне таго, што пазбаўляеш дзяржаву падатковых даходаў, не прыносіць асаблівых маральных пакут.

Варта адзначыць, што тэарэтызацыя ценявой эканомікі ў мадэлі Feld and Schneider (2011) была ажыццёўлена на аснове эмпірычных дадзеных краін Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (OECD), а гэта 34 краіны з развітай рынкавай эканомікай, кансалідаванай дэмакратыяй і вяршэнствам права, з якіх 28 ніколі не мелі досведу планавай эканомікі.

Мы сцвярджаем, што гэтая тлумачальная мадэль спраўляецца і з трансфармацыйнымі кейсамі. Так, ключавая праблема рэгіёну ў 90-я – немагчымасць дзяржавы ўтрымліваць веберыянскія манаполіі[7] і адсутнасць «уманціраванай аўтаномнасці» дзяржавы (легітымнасць рэгулятара і дыстанцыраванасць ад аб'екта рэгулявання) адносяцца да фактару «якасць дзяржаўных інстытутаў». Інерцыя адносін савецкага грамадзяніна і савецкай дзяржавы («адны робяць выгляд, што працуюць, а іншыя – што плацяць») і выкарыстанне нефармальных інстытутаў бартару і блату з мэтай падмануць дзяржаву ў гэтай мадэлі праходзіць пад рубрыкай «падатковая мараль».

Пры гэтым варта зрабіць наступнае дапушчэнне: беларуская эканамічная мадэль з высокай цэнтралізацыяй кіравання, значнай доляй дзяржаўных прадпрыемстваў, наяўнасцю інстытута мяккіх бюджэтных абмежаванняў і субсідзіравання адрозніваецца ад пяці іншых кейсаў, у якіх працэс пабудовы і кансалідацыі капіталізму быў завершаны. Тое, што эканомсацыёлагі называлі «фіскальным кантрактам» – «падаткі ў абмен на прадстаўленне інтарэсаў» – працуе ў Беларусі ў меншай ступені. Дзяржава, якая мае самастойныя непадатковыя крыніцы даходаў (разнастайныя рэнты), з'яўляецца хутчэй донарам пабочных плацяжоў насельніцтву і ў меншай ступені пераразмяркоўвае падатковыя паступленні.

[7] Напрыклад, ценявая эканоміка ў Германіі ў 1994 годзе па сутнасці адрознівалася ад ценявой эканомікі ва Украіне ў 1994 годзе, дзе пасля трох гадоў пераходнага перыяду ўсё яшчэ не было адзінай сістэмы падаткаабкладання і нават поўнага пераліку зарэгістраваных прадпрыемстваў, што падлягаюць падаткаабкладанню. У 1991 годзе ценявая эканоміка ў Аўстрыі моцна адрознівалася ад ценявой эканомікі ў Расіі, дзе ўрад дазволіў недэклараваны стыхійны гандаль у любых грамадскіх месцах (што ператварыла краіну ў адну вялікую базарную плошчу) з адзінай мэтай: пазбегнуць голаду і змякчыць наступствы эканамічнага крызісу.

## 2. Успрыманне ценявой эканомікі. Верагоднасць быць злоўленым і ўспрыманне пакарання

Як было сказана, даследаванні дэманструюць залежнасць ценявой эканомікі ад пераменнай «падатковай маралі» – у працы Feld and Schneider (2011) гэта другі па значнасці фактар. Адпаведна, для разумення феномену ценявой эканомікі патрабуецца аналіз грамадскіх поглядаў на ценявую дзейнасць.

Як людзі ацэньваюць строгасць пакарання і верагоднасць быць злоўленым пры ўдзеле ў ценявой дзейнасці?

**Дыяграма 1. Верагоднасць быць злоўленым, працуючы без працоўнага кантракту ці атрымліваючы частку заробку «ў канверце»**




Як бачна з дыяграмы, беларусы знаходзяцца на другім месцы пасля шведаў у тым, што тычыцца ацэнкі верагоднасці быць злоўленым, працуючы без афіцыйнага працаўладкавання і (або) атрымліваючы частку заробку ў канверце. Так, 46% рэспандэнтаў лічаць, што верагоднасць быць злоўленым высокая або вельмі высокая, а 51% лічыць, што яна нізкая або вельмі нізкая. На ацэнку верагоднасці ўплывае папярэдні досвед занятасці ў шэрай эканоміцы: тыя, у каго ён ёсць, ацэньваюць рызыку пакарання як вельмі нізкую.

**Дыяграма 2. Верагоднасць быць злоўленым, набываючы тавар ці паслугу ў прадаўца, які не рэгіструе продаж ці не сплачвае падаткі**




У тым, што тычыцца верагоднасці быць злоўленым, купляючы што-небудзь у прадаўца, які не рэгіструе продаж або не плаціць падаткі, Беларусь таксама займае другое месца (53% рэспандэнтаў лічаць, што верагоднасць нізкая або вельмі нізкая, а 46% – што высокая або вельмі высокая) і дэманструе вынікі, больш за ўсё падобныя да польскіх.

**Дыяграма 3. Успрыманне пакарання за працу без працоўнага кантракту/частку заробку «ў канверце»**




Палова рэспандэнтаў ацанілі пакаранне за «працу ў ценю» як суровае (суровае і вельмі суровае), а 46% як мяккае або досыць мяккае. Пры гэтым, як відаць з графіка ніжэй, 54% рэспандэнтаў назвалі мяккім і досыць мяккім пакаранне за куплю тавару ў «шэрага» прадаўца.

**Дыяграма 4. Успрыманне пакарання за набыццё тавару ці паслугі ў прадаўца, які не рэгіструе продаж ці не сплачвае падаткі**




**Дыяграма 5. Апраўданне працы без працоўнага кантракту, калі ўвесь заробак выплачваецца «ў канверце»**



**Дыяграма 6. Апраўданне працы з працоўным кантрактам, калі частка заробку выплачваецца «ў канверце»**




Прадказальна, што 33% рэспандэнтаў са Швецыі выказваюць адназначнае асуджэнне нават паўлегальных формаў працаўладкавання, у той час як рэспандэнты з краін з традыцыяй планавай эканомікі куды менш радыкальныя ў ацэнках. Рэспандэнты з Беларусі і Латвіі ў большай ступені, чым усе астатнія, апраўдваюць шэрую занятасць, у якой частка заробку выплачваецца пад сталом (51% і 53% адпаведна). Падобныя вынікі беларусы і латвійцы дэманструюць, хутчэй апраўдваючы або цалкам апраўдваючы пакупкі, здзейсненыя ў шэрых прадаўцоў (38% і 42% адпаведна).

**Дыяграма 7. Апраўданне пакупак у легальных магазінах, калі пакупнік ведае пра тое, што прадавец не рэгіструе аплату**




В

У межах даследавання таксама задавалася пытанне пра такія віды дзейнасці як кантрабанда, нелегальная вытворчасць і продаж цыгарэт, алкаголю і паліва.

**Дыяграма 8. Апраўданне такой дзейнасці як кантрабанда, нелегальная вытворчасць і продаж цыгарэт, алкаголю і паліва**




Парадаксальна, але беларусы аказаліся найменш талерантнымі да падобных шэрых відаў дзейнасці: толькі 3% апытаных гэта цалкам апраўдваюць, 9% – хутчэй апраўдваюць, а вось 90% асуджаюць. Гэта здаецца асабліва дзіўным, улічваючы аб'ёмы прыгранічнага гандлю і абароту цыгарэт і паліва ў Літве, нелегальна ўвезеных з Беларусі.

**Дыяграма 9. Прычыны здзяйснення пакупак «у ценю»**




| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Купляць тавары і паслугі афіцыйна занадта дорага | Людзі не ведаюць, што прадавец працуе нелегальна або не дэкларуе даходы | Тавары і паслугі лёгка даступныя на шэрым рынку | Цяжка знайсці асобныя тавары ў легальных прадаўцоў | Іншае | Няма адказу |

Асабліва цікава тое, што беларусы часцей за рэспандэнтаў з іншых пяці краін выбіраюць варыянты адказу «тавары і паслугі лёгка даступныя на шэрым рынку» і «вельмі складана ці немагчыма знайсці канкрэтны тавар і паслугу легальна». Таксама беларусы радзей за ўсіх спасылаюцца на высокі кошт легальнага набыцця тавару ці паслугі як на прычыну пакупкі ў шэрай эканоміцы.

Колькі грошай беларусы трацяць на ценявыя пакупкі? У межах нашага даследавання мы папрасілі рэспандэнтаў ацаніць штомесячныя траты «ў цяню». Для ацэнкі мы прапанавалі рэспандэнтам шкалы і атрымалі наступныя разлікі.

**Дыяграма 10. Штомесячныя траты на тавары і паслугі, набытыя «ў цяню» (сярэдняе ўзважанае ў еўра)**




Больш за ўсё грошай у цяню траціцца шведамі, беларускія рэспандэнты па сваіх адказах знаходзяцца бліжэй за ўсё да латвійскіх (59 і 57 еўра адпаведна). Гэта можа быць звязана з узроўнем цэн і даходаў у гэтых краінах.

## 3. Уцягванне ў ценявую эканоміку

Дадзеная частка аналізу прысвечана ўключэнню ў ценявы гандаль і занятасць. Уцягванне ў ценявы гандаль падзяляецца на дзве катэгорыі: а) набыццё легальных тавараў і паслуг у легальна зарэгістраванага прадаўца, пры якім пакупнік не атрымлівае чэк, а крама не рэгіструе продаж; б) пакупка легальных тавараў і паслуг у незарэгістраванага прадаўца, пры якой адпаведныя падаткі не выплачваюцца ў прынцыпе.

**Дыяграма 11. Досвед здзяйснення пакупак у легальнага прадаўца, але без чэка**




Як відаць з дыяграмы, 17% рэспандэнтаў з Беларусі часам (да 10 разоў на год) або рэгулярна (больш за 10 разоў на год) здзяйсняюць пакупкі і не атрымліваюць чэк ад прадаўца. Чэмпіёнам па пакупках без чэка з'яўляюцца літоўскія рэспандэнты: іх доля – 31%.

**Дыяграма 12. Досвед здзяйснення пакупак у нелегальных прадаўцоў**




Беларусь і Эстонія знаходзяцца ў цэнтры спісу. Лідарам з'яўляецца Латвія, а найбольш дысцыплінаванымі пакупнікамі – рэспандэнты са Швецыі.

Цікавае размеркаванне пакупак у шэрай зоне па тыпах тавараў і паслуг сярод беларускіх рэспандэнтаў. Даследаванне паказвае, што часцей за ўсё беларусы трацяць грошы ў ценявой эканоміцы на наступныя катэгорыі тавараў і паслуг: адзенне (46%), прадукты харчавання (25%), транспартныя паслугі (20%), рамонт / сэрвіс аўтамабіляў (18%), бытавая тэхніка, гаджэты, аўдыё- і відэатэхніка (15%), рамонт і будаўніцтва (13%), будаўнічыя матэрыялы (10%) і арэнда нерухомасці (10%).

Як ужо было сказана, рэспандэнты ацэньвалі сваю ўцягнутасць у ценявую працу. Пры гэтым мы прасілі рэспандэнтаў адказаць на наступнае пытанне:

**Дыяграма 13. Ці ёсць у вас сябры/члены сям'і, занятыя ў шэрым рынку працы (праца без кантракту і / ці атрыманне часткі / усяго заробку «ў канверце»)?**




Як бачна з дыяграмы, Беларусь знаходзіцца ў цэнтры спісу, і размеркаванне адказаў найбліжэйшае да літоўскіх рэспандэнтаў.

Важнае пытанне – размеркаванне занятых у шэрай эканоміцы па сектарах. Такім чынам, «сябры / сваякі», занятыя ў ценявой эканоміцы, часцей за ўсё працуюць у наступных сферах: будаўніцтва і рамонт (48%), аптовы і рознічны гандаль (29%), рамонт / сэрвіс аўтамабіляў (22%), транспарт і лагістыка (14%). Структура сектараў у дадзеным даследаванні падобная ва ўсіх краінах.

Пытанні пра досвед удзелу ў ценявой эканоміцы задавалі такім чынам, каб максімальна зняць напружанасць у рэспандэнтаў. Для гэтага пыталіся пра веданне рэспандэнтаў пра досвед трэціх асоб (сябры і сваякі). Але, акрамя гэтага, задавалі пытанні і пра ўласны досвед рэспандэнтаў.

**Дыяграма 14. Уласны досвед удзелу ў ценявым рынку працы (праца без кантракту або атрыманне часткі ці ўсяго заробку «ў канверце»)**




Дыяграма цікавая перш за ўсё тым, што беларускія рэспандэнты, нароўні з палякамі, з'яўляюцца лідарамі па прызнанні інтэрв'юерам у здзяйсненні дзеянняў, якія пераследуюцца па законе (гэта да пытання пра сацыялогію ў аўтарытарных рэжымах). Па-другое, цікавы і наступны факт: 9% беларусаў прызналіся ва ўласным досведзе занятасці ў ценявой эканоміцы і 29% паказалі на сяброў / сваякоў.

Што тычыцца «тыпаў» ценявой занятасці, то сярод тых, хто прызнаўся ў падобных дзеяннях, 50% працавалі без адпаведнага кантракта / дагавора і атрымлівалі ўсю кампенсацыю «ў канверце», 32% працавалі з адпаведным афармленнем (частка заробку ім выплачвалася «пад сталом» ), 20% працавалі на сябе і не дэклараваў частку даходу або ўвесь даход.

Колькі гадзін беларускія рэспандэнты працавалі «ў цяні» і які прыбытак прыносіла падобная дзейнасць? Рэспандэнтам было прапанавана ацаніць: а) колькасць гадзін на тыдзень, якія

яны працавалі «у цяні», і б) даход ад падобнай дзейнасці. Поўны аналіз гэтых лічбаў можна знайсці ў агульнай справаздачы, прадставім толькі высновы.

**Дыяграма 15. Колькасць гадзін на тыдзень, якія рэспандэнты працавалі «ў цяні» (узважаны сярэдні паказчык)**




Як бачна, сітуацыя ў Беларусі вельмі падобная да сітуацыі ў Польшчы і Эстоніі.

Наступная дыяграма ацэньвае даход рэспандэнтаў ад падобнай дзейнасці. Мы атрымалі гэтыя лічбы, задаючы рэспандэнтам пытанне пра прыкладныя межы даходу ад ценявой занятасці.

**Дыяграма 16. Штомесячны даход ад ценявой занятасці (узважаны сярэдні паказчык)**




Як бачна, Беларусь знаходзіцца на перадапошнім месцы: сярэдні даход занятага ў шэрай эканоміцы складае 294 еўра. Гэты паказчык падобны з літоўскім. Найбольшы ён у Швецыі (797 еўра).

## 4. Ценявая эканоміка: прыблізныя разлікі на макраўзроўні

Існуе некалькі метадалогій ацэнак аб’ёму ценявой эканомікі.

Адзін шлях – гэта, паводле метадалогіі Rockwool Foundation Research Unit (Petersen, S. 2003; Feld, LP, & Larsen, C. 2005), параўнаць прапорцыю занятасці ў афіцыйнай і шэрай эканоміках (мяркуючы пра падабенства прадуктыўнасці). Іншы шлях – выкарыстоўваць аб’ём даходаў, атрыманых ад ценявой занятасці. Ніжэй прадстаўленыя вынікі разлікаў па абедзвюх метадалогіях.

**Дыяграма 17. Ценявыя працоўныя гадзіны як доля ад агульных працоўных гадзін (злева)**

**Дыяграма 18. Аб’ём ценявой занятасці ў прапорцыі да ВУП (справа)**







Як бачна, паводле другой метадалогіі, Беларусь з’яўляецца лідарам сярод шасці краін па долі ценявой занятасці ў прапорцыі да ВУП. Найменшая праблема з аб’ёмамі ценявой занятасці ў Швецыі.

Нарэшце, з выкарыстаннем падобных метадаў ацэненыя аб’ёмы ценявой эканомікі з пункту гледжання незарэгістраваных пакупак.

**Дыяграма 19. Аб’ём незарэгістраваных пакупак у прапорцыі да ВУП**




У гэтым пытанні Беларусь зноў становіцца лідарам спісу, а Швецыя – кейсам з найменшымі праблемамі. Прадставіўшы вынікі нашага даследавання ў параўнальнай перспектыве, спынімся падрабязней на беларускім кейсе.

## 5. Драйверы на мікраўзроўні: урокі з Беларусі

Паводле даследавання, адным з фактараў ценявой эканомікі (галоўнай прычынай пакупкі тавараў або паслуг у нелегальнага пастаўшчыка або пастаўшчыка, які не дэкларуе свой даход) з'яўляецца ўяўленне пра тое, што легальнае набыццё занадта затратнае (54% рэспандэнтаў пазначылі гэта ў якасці галоўнай прычыны). Адзенне з'яўляецца найбольш папулярнай катэгорыяй тавараў, якія набываюцца незаконна (46%). **Таму памяншэнне цэн пры адначасовым росце даходаў можа знізіць аб'ём нелегальных пакупак.**

Тая ж сітуацыя адбываецца з нелегальным працаўладкаваннем. Галоўнай прычынай, з якой людзі вырашаюць працаваць без юрыдычна афармленага працоўнага кантракту або атрымліваць частку заработнай платы ў канверце, з'яўляецца магчымасць зарабіць больш пры ажыццяўленні незарэгістраванай працоўнай дзейнасці ва ўмовах высокіх працоўных падаткаў (65% рэспандэнтаў адзначылі гэта як галоўную прычыну нелегальнага працаўладкавання). Пры тым вылучаюцца два фактары: нізкі ўзровень заработнай платы (прынамсі так ён успрымаецца рэспандэнтамі) і высокі ўзровень падаткаў (у выпадку Беларусі самым важным іх складнікам з'яўляюцца сацыяльныя адлічэнні, паколькі 34% зарплаты работнікаў выплачваюцца ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва).

Развіццё ценявой эканомікі таксама вызначаюць фактары структурных адрозненняў. Занятасць у ценявой эканоміцы больш характэрная для найменш сацыяльна абароненых груп; атрыманне ўсяго заробку ў канверце пры адсутнасці працоўнага кантракту часцей успрымаецца як належнае жыхарамі сельскай мясцовасці. Такія тэндэнцыі робяць гэты феномен сацыяльна небяспечным. Як паказвае даследаванне, наяўнасць ценявой занятасці больш характэрна для маладых людзей. Можна меркаваць, што падобныя практыкі будуць распаўсюджвацца адначасова са сталеннем маладога пакалення. Тым не менш, маладыя людзі не схільныя незаконна набываць тавары і паслугі – гэта дазваляе выказаць здагадку, што дадзеная практыка з часам стане менш распаўсюджанай.

Другі фактар, які адрознівае пакупку тавараў або паслуг ад нелегальных пастаўшчыкоў або пастаўшчыкоў, што не дэкларуюць свой даход, заключаецца ў тым, што людзі папросту не ведаюць, што пастаўшчык працуе па-за юрыдычнымі межамі ці не заяўляе свой прыбытак. Жанчыны часцей за мужчын мяркуюць, што адрозніць такіх пастаўшчыкоў немагчыма. Акрамя таго, стаўленне да іх пакарання адрозніваецца сярод больш маладых груп. Гэты факт не можа быць аднесены да іх досведу ценявой дзейнасці, а можа тлумачыцца рознымі прычынамі адукацыйнага і інфармацыйнага характараў.

Важна адзначыць, што найбольш эканамічна актыўныя і вопытныя людзі (мужчыны і людзі з больш высокімі даходамі) схільныя недаацэньваць верагоднасць выяўлення незаконнай дзейнасці з боку дзяржавы. Гэта можа стаць фактарам, які павялічвае рызыку развіцця ценявой эканомікі, бо гэтыя групы могуць выступаць лідарамі меркаванняў.

Важным драйверам ценявой эканомікі з'яўляецца і досыць высокі ўзровень апраўдання (успрымання як нармальнай) недэкларавай эканамічнай дзейнасці. Паводле даследавання, 40% рэспандэнтаў схільныя апраўдваць ці апраўдваюць нелегальную занятасць, у той час як 38% апраўдваюць незаконнае здзяйсненне пакупак. Атрыманне заробку ў канверце ўспрымаецца як нармальная з'ява паловай насельніцтва (51%).

Палова рэспандэнтаў ацэньваюць верагоднасць выяўлення дзяржавай факту занятасці без юрыдычна афармленага кантракту або практыкі атрымання хаця б часткі заробку ў канверце як нізкую. Прыкладна такая ж частка (53%) вызначае як нізкую верагоднасць вылічэння факту пакупкі тавару ці паслугі ў незарэгістраванага пастаўшчыка, які не плаціў падаткі.

Падобным жа чынам успрымаецца суровасць пакарання за працу без кантракту або атрыманне «шэрай» заработнай платы. Доля тых, хто мяркуе, што пакаранне будзе мяккім (досыць мяккім або вельмі мяккім) роўная амаль палове апытаных – 46%. Ацэнка суровасці пакарання за куплю тавараў або паслуг у нелегальнага пастаўшчыка амаль супадае з

успрыманнем магчымасці выяўлення дзяржавай такіх практык: 54% лічаць, што пакаранне будзе мяккім у дадзеным выпадку.

Папярэдні досвед удзелу ў ценявой дзейнасці можа быць важным фактарам, вызначальным для распаўсюджвання ценявой эканомікі: ён уплывае на стаўленне да ценявых практык як такіх і на пакаранне за іх. У цэлым, людзі ўспрымаюць магчымасць выяўлення нелегальнай дзейнасці як нізкую. Кажучы пра рынак працы, галоўнай прычынай, якая ўплывае на ўяўленне пра верагоднасць выкрыцця нелегальных практык, выступае ўласны досвед незарэгістраванай дзейнасці. Большасць людзей, якія маюць такі досвед, ацэньваюць верагоднасць выкрыцця як нізкую (64% бачаць яе як досыць нізкую або вельмі нізкую), тады як людзі, што раней не ўдзельнічалі ў ценявой эканоміцы, радзей ацэньваюць яе падобным чынам (50% – як досыць нізкую або вельмі нізкую). Нарэшце, тыя, хто калі-небудзь набываў нешта незаконным шляхам, ацэньваюць верагоднасць выяўлення такога злачынства як нізкую часцей (57%), чым рэспандэнты без падобнага досведу (51%).

Той факт, што толькі 13% рэспандэнтаў незаконна набывалі алкаголь, можа патлумачыць нізкі ўзровень прымальнасці такой ценявой дзейнасці як нелегальныя вытворчасць і продаж цыгарэт, алкагольных напояў і бензіну. Іншыя ж ценявыя практыкі ўспрымаюцца як больш прымальныя. Таму людзі, занятыя ў ценявой эканоміцы, схільныя разглядаць верагоднасць пакарання як больш нізкую і, адпаведна, схільныя ў большай ступені апраўдваць незарэгістраваную дзейнасць. Як вынік, яны маюць менш бар'ераў у плане ўключэння ў ценявую эканоміку.

## Высновы

У дадзеным даследаванні эксперты свядома адышлі ад абагульненых ацэнак ценявой эканомікі і вырашылі спусціцца з узроўню лічбаў і агрэгаваных паказчыкаў на ўзровень грамадства, каб даследаваць стаўленне рэспандэнтаў з шасці краін да феномену ценявой эканомікі.

У дачыненні да Беларусі прадэманстравана наступнае:

1. Беларусь лідзіруе сярод шасці краін па аб’ёме ценявой занятасці;

2. Беларусь лідзіруе сярод шасці краін па аб'ёме пакупак у цяні;

3. беларускія рэспандэнты разумеюць рызыку быць злоўленымі і ўспрымаюць пакаранне як досыць суровае;

4. сектары, у якіх ценявая дзейнасці найбольшая: будаўніцтва і рамонт, аптовы і рознічны бізнес, звязаны з гандлем адзеннем і прадуктамі харчавання, аўтамабільны бізнес, а таксама бізнес, звязаны з продажам бытавой тэхнікі.

Пры гэтым, як ужо было сказана, ценявая эканоміка шкодзіць дзяржаве, але мае і адваротны эфект – стварае эканамічную вартасць. І з пункту гледжання грамадскага выжывання ў крызіс, улічваючы негатыўныя прагнозы беларускай эканомікі і складанасці з падтрыманнем у краіне пераразмеркавальнай мадэлі, сыход у цень можа быць натуральным эфектам і своеасаблівай падушкай бяспекі.

**Як змагацца з ценявой эканомікай?**

Па-першае, патрабуюцца меры па зніжэнні бар’ераў для бізнесу і нармалізацыі дзелавога асяроддзя (падатковая рэформа, дэрэгуляванне шэрагу відаў дзейнасці і г. д.).

Па-другое, патрабуецца далейшае павышэнне рызыкі ўдзелу грамадзян у ценявой эканоміцы. Гаворка тут ідзе не столькі пра тое, каб прыняць драконаўскія меры (як, напрыклад, Дэкрэт аб дармаедстве) або ўзмацніць пакаранне, а каб зрабіць правапрымяненне больш эфектыўным.

Па-трэцяе, патрабуюцца намаганні па змяненні стаўлення грамадзян да ценявой дзейнасці. Верагодна, гэта адбудзецца, калі дзяржава стане больш адкрытай у тым, што тычыцца размеркавання бюджэтаў, павысіць якасць дзяржаўных паслуг і паспрабуе зрабіць падаткаплацельшчыкаў партнёрамі, а не донарамі грошай. У гэтым сэнсе цікава, што беларусы больш за астатніх асуджаюць кантрабанду і нелегальны бізнес з палівам, цыгарэтамі і алкаголем. Дадзены феномен патрабуе далейшага даследавання.

Па-чацвёртае, зніжэнне цэн і павышэнне даходаў стануць фактарам, які зніжае аб’ёмы шэрай эканомікі.

## Літаратура

1. Allingham, M. G., and Sandmo, A., (1972) 'Income tax evasion: a theoretical analysis'. Journal of Public Economics
2. Feld, L.P. and Schneider, F., (2011) Survey on the shadow economy in OECD countries.
3. Johnson, S. Kaufmann, D. and Zoido-Lobaton, P. (1998), Regulatory Discretion and the Unofficial Economy, American Economic Review.
4. Kanniainen, V., J. Paakonen and Schneider, F. (2004), 'Fiscal and ethical determinants of shadow economy: theory and evidence', Discussion paper. Department of Economics, Johannes Kepler University of Linz, Linz, Austria.